Bialystok, den 9. August 1942
Nr. 20

NEUER WEG
Weissruthenische Wochenzeitung für den Bezirk Bialystok

PREIS 20 PF.
Цана 20 фнг.

# НОВАЯ ДАРОГА

Беларуская тыднёвая газэта на Беластоцкую Акругу

Verlag: Sturmverlag G. m. b. H. Zweigniederlassung Bialystok, Lindenstr. 64, Tel. 437 — Bankkonto Stadtsparkasse 700. Anzeigenpreise: z. Zt. ist die Preisliste 1 gültig.

Беласток
9-га жніўня 1942.

Адрас Рэдакцыі: Sturmverlag G. m. b. H. Zweigniederlassung Bialystok, Lindenstr. 64, Tel. 437—
Банкконто Гарадзкая Каса Ашчаднасьці 700
Цана абвестак паводле лісты цэнаў 1.

## Памяці Пётры Рандарэвіча, згінуўшага 20.7.1942 г. у Ракэвічах з рук бандытаў

*З душою чыстай,*
*З воляй агністай,*
*Народ з дрымоты ты будзіў —*
*Каб зварухнуўся,*
*К жыццю прачнуўся,*
*Каб окінуў цемру і аджыў.*

*З юнай павагай,*
*Шчыра, з адвагай,*
*У варожы кінуўся Ты бой,*
*І згінуў горды,*
*Баец ты цьвёрды,*
*За Беларусь і гонар свой!*

К. САГАЦІС.

## Англія баіцца за забясьпечаньне Саветаў

Англійскае інфармацыйнае бюро 30 ліпеня абвесьціла, што палажэньне на ніжнім Доне такое-ж паважнае, як і раней. Гэтае заяўленьне акончальна разьвейвае ілюзыі пэўных англійскіх кругоў, быццам кінутыя цяпер у бой новыя рэзэрвы Цімашэнкі змаглі-б якім-небудзь чынам зьмяніць абраз вайны на ўсходзе. А з другога боку ўсё больш чуваць праціўныя галасы. Тады, як адна старана цьвердзіць, што быццам небясьпека для Сталінграду сталася меншай, другая якраз наадварот — цьвердзіць, што наступ на Сталінград адбываецца з двух бакоў. Падобна гаворыцца й аб Батайску, страту якога саветы яшчэ ня прызналі, што быццам савецкія войскі яшчэ «заўзята нападаюць». Насуперач панучым дапушчэньням аб пасьпяховых апэрацыях у сэктары Варонежа маскоўскі прадстаўнік газэты «Нью Кронікль» з роспаччу заяўляе, што баі каля Варонежа ня прынясуць ані якога адпляжэньня і ня маюць ніякага ўплыву на галоўную бітву над ніжнім Донам.

Англійцы паведамляюць аб далейшых пераправах праз раку нямецкіх войскаў і на сярэднім адрэзку аграмаднае бітвы. Аграмадныя масы нямецкіх войскаў і матарыялу пераправяюцца праз Дон. Па савецкай старане, якая знаходзіцца пад пагрозай, праводзяцца ў гарачцы працы па ўборцы збожжа.

Аб тым, як ваенныя пляўдачы саветаў адбіваюцца па іх гаспадарцы, дае паняцьце ўласная карэспандэнцыя «Таймсу» з Масквы. Там зьвяртаецца ўвага на тое, што для англійпаў упадак Растова яшчэ будзе навіпай, калі выявяцца поўнасьцю яго насьледкі адносна Каўказкага абшару. З Растова выходзіць дарога на Баку, сам горад знаходзіцца над Азоўскім морам і зьяўляецца выхадным пунктам судаходства на Дану. Усё гэта сьведчыць аб вялікім значэньні Растова, як гаспадарчага цэнтру, страту якога нельга дазваляць. Немцы занялі цяпер надзвычай ураджайны край. Страты аднаго толькі збожжа надзвычай вялікія.

У паведамленьнях, зьмешчаных у газэце «Унітэд Прэс», апісваюцца распачлівыя баі савецкіх войскаў у раёне Паўночнага Каўказу. Іх распачлівая барацьба ўтрудняецца тым, што найважнейшыя жалезнадарожныя і шасэйныя шляхі ў тылох зьнішчаны дзякуючы бязупыннym налётам нямецкага лятунства. З савецкага ваеннага боку ўсьпяж падчырківаюць, што вораг ня толькі колькасьцю перавышае ўва ўсім, але і азбраеньнем, а перадусім якасна.

Швэдзкія камунікаты з Лёндану зазначаюць, што паводле поглядаў адказных ваенных кругоў падзеі на ўсходнім фронце зьбліжаюцца да найбольшае хіба разьвязкі з усіх дасюлешніх у гэтай вайне. Англійскае ваеннае кіраўніцтва ня можа нічога прадпрыняць, каб зрабіць якія-небудзь стратэгічныя зьмены, падобна як і ў часе катастрофы Францыі. Уся англійская стратэгія ў Эўропе ў апошнія паўгодкі разьлічала на тое, што Савецкі Саюз зможа пратрымацца да часу, калі Англія й Амэрыка падрыхтуюцца да ініцыятывы. Але гэтага ўсе спадзяваліся толькі вясной 1943 году. Праўда, ані ў Лёндане, ані ў Вашынгтоне, відаць, і ня думалі, што гэта станецца, але цяпер дасюлешнія посьпехі нямецкае афэнзывы адкрылі зусім «неспадзяваныя магчымасьці».

У савецкіх кругох і ў англійскай сталіцы перадусім баяцца, каб ня быў адрэзаны Каўказ. Ніхто ўжо не пярэчыць, што ў выніку стратаў важных прамысловых раёнаў савецкая ваенная індустрыя значна аслаблена. Найбольшай, аднак, небясьпекай, якая навісла над саветамі, лічыцца страта збажэвых багатых абшараў.

У Лёндане й Вашынгтоне цяпер вядзецца прапаганда, каб павялічыць дастаўкі для бальшавікоў. Пастановы апошніе нарады ваеннае рады ў Вашынгтоне прадугледжваюць па магчымасьці найбольшую помач саветам. Прафэсыянальны саюз рабочых, працуючых у індустрыі, зьвярнуўся да Рузвэльта з дамаганьнем стварэньня зараз-жа другога фронту.

Англійскі міністар замежных справаў Ідэн прыняў 28-га ліпеня савецкага пасла Майскага. Чэрчыль у той-жа дзень быў прыняты каралём Гэоргам VI. Праўдападобна, ён гаварыў у сувязі з адмовай выступіць у Ніжняй Палаце.

Плютакраты ўжо многа гаварылі, яны й цяпер найлепш разьвязваюць ваенныя справы гаварнёй. Яны гавораць і пастаноўляюць памагчы Савецкаму Саюзу, але кожны ведае, як практычна выглядае гэтая помач і якія яе магчымасьці з увагі на недахоп караблёў. Тымчасам нямецкі жаўнер наносіць ворагу ўдар за ўдарам з няслабнучай сілай.

## Варашылаўск здабыты

**Як паведамляе Найвышэйшае Камандаваньне Арміі, на ўсход ад Азоўскага мора зматарызованыя ўгрупаваньні і часьці 4 у сьмелым наступе дасягнулі Кубань у многіх мейсцах. Прамысловы горад Варашылаўск пасьля заўзятае барацьбы здабыты. Эскадры самалётаў атакуюць уцякаючыя калёны ворага і бамбардуюць удзень і ўначы варожыя лётнішчы, транспарт і жалезнадарожныя ўладжаньні аж да Каўказу.**

## Ізноў нямецкія налёты на Англію

Як паведамлялася з Англіі, уночы на аўторак нямецкія баявыя самалёты правялі шматлікія бамбардыроўкі. У Лёндане таксама некалькі разоў была паветраная трывога, адна з іх трывала 24 гадзіны.

У многіх раёнах англійскае сталіцы чутны быў гул гарматаў. Нямецкія самалёты, як падаюць англійскія камунікаты, атакавалі галоўным чынам прамысловыя гарады ў заходняй Англіі. Наступна дакнёны налётамі вялікія абшары паўночнай і ўсходняй Англіі, а таксама графствы, распаложаныя каля Лёндану. Бамбардыроўка праводзілася нават у Паўночнай Ірляндыі.

Бамбардаваліся важныя прамысловыя і партовыя цэнтры Англіі, як Гэл, Марсэ Матрук, Бірмінгам, Ёрк і інш. Скінуты тысячы запальваючых і разбурваючых бомбаў. Прычынены вялікія зьніштажэньні і ўзьнечаны шырокія пажары. Нямецкія самалёты бамбардуюць часткова ў прыземных палётах.

**НОСВЫЯ АБРАЗЫ З ЗДАБЫЦЬЯ ВАРОНЕЖУ.**

Процілятунская артылерыя прыймае ўдзел у баёх наземных войскаў

# ВАЙНА

**За апошні тыдзень нямецкімі й саюзніцкімі войскамі асягнуты далейшыя аграмадныя посьпехі на ўсіх фронтах на сушы й на моры. Увесь сьвет з найбольшым напружаньнем сочыць за нямецкай афэнзывай на поўдні Савецкага Саюзу. Цяпер ясна, што, канцэнтруючы ўдар у вадным мейсцы, нямецкая афэнзыва мае найлепшыя магчымасьці дастаўкі й ваеннага плянаваньня. Ваенныя апэрацыі за апошні тыдзень прынясьлі цэлы рад новых бліскучых посьпехаў. Нямецкія войскі бязупынна прасьледуюць уцякаючага ворага. На поўдзень ад ракі Саль зматарызаваныя войскі здабылі штурмам горад Пралетарская і прарвалі ў многіх мейсцах жалезнадарожнае спалучэньне паміж Каўказам. У загібе Дону варожым сілам адрэзана дарога да адступленьня.**

**На шырыні 250 км. пяройдзена ніжняе цячэньне Дону і разьбіты кінутыя сюды ў мэтах абароны савецкія войскі. Пярэднія часьці нямецкіх войскаў, якія знаходзяцца на чале афэнзывы, ужо прасунуліся больш як на 180 км. на поўдзень ад Дону. Здабыты жны жалезнадарожны вузел Сольск. Здабыты горад Шахты. Адна пяхотная дывізыя здабыла Кучэвскую. Вораг уцякае ў бязладзьдзі. У часе прасьледаваньня разьбітага ворага шырокім фронтам пяройдзена жалезнадарожная лінія Краснадар—Сталінград. Нямецкія войскі зайшлі ў Кубань. Паміж ракой Саль і Донам нямецкія й румынскія войскі гоняць ворага далей на ўсход, прасьледуючы яго па пятах.**

**На жалезнадарожныя спалучэньні ў тылавым абшары Кубані і жалезнадарожную лінію Растоў—Баку праводзяцца бязупынна цяжкія налёты бамбардыроўшчыкаў. Пасьля заўзятых баёў здабыты важны прамысловы горад Варашылаўск. Нямецкае лятунства бязупынна падтрымоўвае акцыю наземных войск, нішчачы транспарт. Разьбіта шмат цягнікоў, якія мелі на мэце забясьпечаньне савецкае арміі. У выніку налётаў разьбіта, між іншым, станцыя ў горадзе Армавіры, а ў самым горадзе выкліканы вялікія пажары. Налёты праводзяцца аж да Каўказу. Нямецкія войскі прабіліся праз жалезнадарожную лінію Сальцк—Ціхарэцк. На ўсход ад яе здабыты горад Бажанта і пяройдзена рака Егорлік.**

Той факт, што Цімашэнка не змог утрымацца на паўдзённым беразе Дону, яшчэ раз сьведчыць, што гэта ня гэтакзванае «адступленьне», а ўцёкі, да якіх змушана савецкая армія пад нямецкім націскам. Калі-б бальшавікі адступалі самахоць з такіх важных збожавых і прамысловых абшараў, то гэта было-б папросту вар'яцтва. Не адступленьне, а паўнейшы разгром бальшавікоў — вось што мы бачым на паўдзённым адрэзку ўсходняга фронту. Цяпер нямецкія войскі знаходзяцца ў Кубані, якая побач з чарназёмнай Украінай прадстаўляе сабой жытніцу Усходу. Сьмяротная небясьпека, якая навісла над Савецкім саюзам, выклікае жах і трывогу ў Англіі й ЗША. Лёндан і Вашынгтон б'юць трывогу. Гэтак, у ваенным аглядзе па радыё з Лёндану гаварылася, між іншым, наступнае: «Немцы ўсё больш параліжуюць баявыя сілы Савецкага Саюзу і адразаюць іх ад найважнейшых прадукцыйных і харчовых цэнтраў, без якіх яны ня могуць ані змагацца, ані жыць».

Бацюшка Сталін ужо бачыць, што яму прыходзіць канец. Як паведамляюць з Нью-Йорку, урад Савецкага Саюзу выслаў у Злучаныя Штаты й Англію афіцыяльнае дамаганьне неадкладнага стварэньня другога фронту. На амэрыканскіх і англійскіх капіталістаў робіць націск Масква і праз Камінтэрн. У Лёндане нядаўна адбыўся сход, на якім камуністы таксама крычалі аб стварэньні другога фронту. Але што могуць зрабіць ваенныя падпальшчыкі Чэрчыль і Рузвэльт? Ваенны матарыял у Савецкі Саюз пасылаць ім амаль немагчыма, бо няма ў іх караблёў, а што выслюць, то нямецкія падводныя лодкі затопяць. Прабавалі яны спадабацца бальшавікам налётамі на нямецкія гарады, але і гэта [illegible] не памог. Прабавалі яны нават ужо і рабіць другі фронт. Мы пісалі аб тым, як некалькі дзесяткаў англійцаў калісь хацела высадзіцца на ўзьбярэжжы Францыі, але ім такога часу далі, што яны ўжо больш не прабуюць гэта рабіць. Вось як выглядае «помач» Англіі і ЗША для Савецкага Саюзу. Гэта, зрэштай, такі іх звычай — чужымі рукамі жар загрэбаць. Многа яны ўжо напамагалі Францыі і Гр[illegible] толькі хочаце.

Нямецкія падводныя лодкі пануюць на моры. Надоячы яны затапілі ізноў 24 гандлёвыя караблі, 10 фрахтараў і 1 вартаўнічы карабель разам у 167.000 БРТ. За месяц ліпень у барацьбе з суднаходствам Англіі й ЗША затоплена ўсяго 815.900 БРТ. Ваенна-марскі флот заталіў 98 гандлёвых караблёў у 632.000 БРТ, з чаго 92 караблі у 613.000 БРТ затапілі нямецкія падводныя лодкі. Лятунства за гэты час затапіла 30 гандлёвых караблёў у 183.000 БРТ. Акрамя таго, шмат караблёў пашкоджана. Толькі нямецкім ваенна-марскім флотам і лятунствам затоплена ад пачатку вайны акругла 19,5 мільёнаў БРТ. Гэта аграмадны транспартны флот, які немагчыма так хутка адбудаваць. Англія й ЗША з усяе сілы імкнуцца будаваць новыя караблі, але пры найбольшых сваіх высілках могуць пакрыць толькі нязначную часьць стратаў, якія наносяць ім нямецкія падводныя лодкі.

У апошнім часе надзвычай узрасла актыўнасьць нямецкага лятунства ў барацьбе супроць Англіі. Хваля за хваляй атакуюць нямецкія самалёты важныя прамысловыя гарады Англіі. У налётах на Бірмінгам скінута вялікая колькасьць разбуральваючых і запальваючых бомбаў. Узьнечаны шырокія пажары. Увесь горад ахінуты густым дымам ад пажараў. Збамбардаваны таксама важныя ў ваенным адношаньні партовыя і прамысловыя гарады Гэл, Ліверпуль, Іорк, Грэт Ярмут і іншыя. Ува Ўсходняй Англіі бамбардуюцца важныя ваенныя аб'екты. У часе ад 23 ліпеня да 2-га жніўня брытанская авіяцыя страціла 248 самалётаў, з гэтага 84 над Міжземным морам і ў Паўночнай Афрыцы. За гэты час у барацьбе з Вялікабрытаніяй згінула 78 нямецкіх самалётаў.

У Эгіпце праводзіліся страшэнныя атакі на лётнішчы каля Каіру. Скінута шмат бомбаў найцяжэйшага калібру. У галях і складах бэнзыны ўзьніклі пажары. Зьнішчана шмат самалётаў, знаходзіўшыхся на пляцох.

Пасьля пэўнага зацішша ў японскай афэнзыве ў Кітаі цяпер ізноў пачалася вялікая акцыя японскіх войскаў. У правінцыі Чэкіянг, каля 270 клм на поўдзень ад Ханькоў, японскія войскі здабылі мясцовасьці Пэхізхэн і Сінлюван. Над паўночнай Аўстраліяй японскія бамбардыроўшчыкі праводзяць цяжкія атакі. Гэтак, збамбардаваны ізноў Порт Дарвін і Квінслэнд.

**Дзяржавы восі б'юць ворага на ўсіх фронтах**




ЗЬНІШЧАНЫЯ САВЕЦКІЯ ТАНКІ У ВАРОНЕЖЫ

Гэтыя танкі былі больш уважныя! Дзесяць з іх разьбіта нямецкім агнём на адным толькі скрыжаваньні вуліц.

# Шахты здабыты!

У ходзе здабыцьця важных абшараў Украіны быў здабыты саюзьніцкімі войскамі вялікі прамысловы горад Шахты. Побач з пэнтрамі — Варашылаўградам і Растовам — горад Шахты, распаложаны на ўсход паміж імі, зьяўляецца пэнтрам паўдзённа-усходняга адгалінаньня вугальнага раёну Данецкага басэйну.

У той час, як у Сталінградзе знаходзіцца адміністрацыя украінскае часткі савецкага вугальнага раёну, «Ворошиловградуголь», Шахты былі мейсцам управы г. зв. «Ростовуголь», вугальнага трэсту паазаукраінскага Данецкага басэйну, падпарадкаванага вялікарасейскай савецкай рэспубліцы РСФСР. Горад ужо ў 1937 годзе лічыў звыш поў мільёна жыхароў. Саветы кінулі вялікія масы рабочых у гэты гаспадарчы пэнтр і выбудавалі яго ў адзін з найважнейшых прамысловых гарадоў, які адрадусім меў асаблівае значэньне ў азбройваючай прадукцыі. 10% усяе савецкае прадукцыі вугальля выдабывалася тут. Рада управы «Ростовуголь» падала на 1937 год колькасьць выдабытага вугальля на 7,8 мільёнаў тоннаў. Аграмадны ўзрост, якому патуралі саветы якраз у гэтым абшары ў апошнім часе, дае падставу думаць, што выдабыцьцё вугальля ад 1937 г. яшчэ больш узрасло. У Шахтах знаходзяцца, акрамя таго, фабрыкі машынаў і вялікая электрастанцыя, якая дае ток усёй паўдзённай часткі Данецкага басэйну. Вугальны пэнтр Шахты адыгрываў пэўную ролю ўжо ў гісторыі ўнутраных разрухаў Савецкага саюзу. У маі 1928 г. Шахты былі выхадным пунктам для масавых абвінавачаньняў у сабатажы, у выніку чаго быў зарганізаваны паказальны працэс у Маскве, каб скіраваць нездаваленьне рабочых у іншы бок. Агітацыйны сэнс гэтае сцэны быў той, каб паказаць рабочым, што вось, маўляў, ува ўсім вінавата капіталістычная загранiца. Разам з 60 савецкімі інжынэрамі былі ў 1928 годзе абвінавачаны ў сабатажы й шпіянажы і 6 нямецкіх інжынэраў. Прычынай, выклікаўшай працэс, была адмова нямецкіх інжынэраў правесьці паравую праверку турбіны, якая ўжо цалком была няздатная да ўжытку. Сталін, які гэтую адмову зараз-жа прадставіў, як замежную інтэрвэнцыю, выкарыстаў працэс у Шахтах, каб абвесьціць новую барацьбу супроць капіталізму. Пад уплывам гэтага працэсу былі перарваны нямецка-савецкія гаспадарчыя перагаворы, якія якраз адбываліся ў тым часе ў Бэрліне.

# Варашылаўск і Екацярынаўка здабыты штурмам

У той час, як нямецкая армія ў пястрыманым маршы б'е і прасьледуе ўцякаючага ворага, паказваючы сваю аграмадную ваенную неарвагу, раптам знайшоўся адзін англійскі «мудрэц», які ў адным ваенным аглядзе разважае, што быццам гэта зусім ня наступ, а выпаўненьне жаданьня ворага (?!). Ён выказаў думку, што бальшавікі сьвядома адступаюць, каб заманіць ворага ў Каўказ (?!). Выходзіць што немцы займаюць аграмадныя землі, б'юць ворага, — а ўсё гэта выходзіць на пляну ворага. Урэшце, калі ворага і разаб'юць, дык акажацца, што і гэта было паводле яго плянаў.

Гэты «мудры» аглядчык можа круціць сабе галаву, як хоча. Найлепшым адказам на брахню «мудраноў» ёсьць жывыя факты, аб якіх паведамляе Найвышэйшае Камандаваньне Арміі. Рака Кубань у многіх мейсцах пяройдзена. Гарады Варашылаўск і Екацярынаўка здабыты штурмам. Каб здабыць Екацярынаўку над Якскай затокай, нямецкая пяхота адважна кінулася ўплаў праз раку Яік. Па ўзьбярэжжы Каўказу зьнішчаны шматлікія калёны.

І ці пасьля гэтага можна назваць уцёкі пабітых на голаву бальшавікоў «заманьваньнем»? Сам Сталін у газэце «Правда» зьвяртаецца да салдатаў з заклікам, каб яны «ані на шаг не адступалі». Уже не «наперад» і не «разаб'ем ворага», а — «не адступаць!...» У трывожных гістэрычных клічах гэты маскоўскі кат адзначае, што «над Савецкім Саюзам навісла сьмяротная небясьпека», што «далейшае адступленьне будзе азначаць загубу бальшавізму».

Каб падагрэць дух сваіх «савецкіх вякаў», ён увёў новыя ордэны Кутузава, Суворава і іншых выканаўцаў расейскага імпэрыялізму. Гэты факт яшчэ раз ускрывае сапраўднае аблічча гэтага Крэмлёўскага дыктатара, які праводзіў далей палітыку расейскіх цароў, апрануўшыся ў чырвоную тогу.

# 80-ЛЕЦЬЦЕ БЕЛАРУСКАЕ ПРЭСЫ

80 гадоў таму назад, у ліпені 1862 г., у Беластоку выйшла першая беларуская (нелегальная) газэта «Мужыцкая Праўда». Выдаў яе вядомы змагар за волю Беларускага Народу — Кастусь Каліноўскі, сам паходзіўшы з Мастаўлян, Ялаўскай воласьці, Ваўкавыскага павету. Кастусь Каліноўскі першы падняў сьцяг нацыянальнага змаганьня і заклікаў беларускі народ **«ваяваць за свайго Бога, за сваё права, за сваю хвалу, за сваю бацькаўшчыну»**. Кастусь Каліноўскі першы паказаў сваёй працай і жыцьцём, як трэба жыць і ўміраць за свой народ. Як вядома, за ўдзел у паўстаньні 1863 г. супроць Масквы, у якім Каліноўскі адыгрываў у Беларусі выдатную ролю й быў фактычным дыктатарам паўстанцкай акцыі, ён быў арыштаваны й, урэшце, павешаны 10.III. (ст. ст.) 1864 г. на Лукіскім пляцы ў Вільні.

Кастусь Каліноўскі разумеў, якое значэньне ў яго дзейнасьці мае друкаванае слова. Таму ён у палове ліпеня 1862 г. пачаў выдаваць нелегальна беларускую газэту пад назовам «Мужыцкая Праўда». Выйшла яе ўсяго сем нумароў. Навонкі газэта выглядала вельмі скромна. Ня гледзячы на гэта, газэта пашыралася сярод беларускага сялянства ў Берасьцейшчыне, Гарадзеншчыне, Дзісеншчыне й па іншых куткох Беларусі. **«Мужыцкая Праўда»** Кастуся Каліноўскага, ня гледзячы на пядоўгае існаваньне й скромны выгляд, (а пісаў яе, з увагі на нелегальнасьць, сам К. Каліноўскі) — **гэта першая беларуская газэта.** Іншай газэты ў тых умовах і абставінах тады быць не магло. Пасьля «Мужыцкае Праўды» паўстае цэлы рад нелегальных беларускіх часапісаў, бо хутка пасьля паўстаньня 1863 г. быў забаронены беларускі друк. Узнаўленьне легальнага друку мы маем аж у пачатку XX сталецьця, калі ў 1906 г. выходзіць «Наша Доля», а пасьля «Наша Ніва».

Значэньне Кастуся Каліноўскага (калі разглядаць яго з пункту гледжаньня далейшага разьвіцьця беларускае прэсы) ня толькі ў тым, што ён даў пачатак беларускай прэсе. **Перадусім ён зьяўляецца сымбалем для ўсіх працуючых у беларускай прэсе й журналістыцы — сымбалем чэснага й вернага служэньня справе свайго народу.** Для яго друкаванае слова ня было самамэтай, а было аружжам у яго працы. Вось гэты варунак павінна спаўняць сапраўды беларуская прэса. **Прэса для нас зьяўляецца вялікім аружжам, незамянімым сродкам у нацыянальным і палітычным узгадаваньні нашага народу.** Таму кожны працаўнік прэсы павінен да сваёй працы адносіцца з як найбольшай самакрытыкай і чуць адказнасьць за кожнае сваё слова. **Для кожнага працаўніка беларускае прэсы постаць яе пачынальніка Кастуся Каліноўскага павінна быць прыкладам крыштальнае сумленнасьці, шчырасьці й адданасьці справе свайго народу.**

Беларуская прэса разьвівалася ў вельмі цяжкіх варунках. Польскі ўрад праследаваў і нішчыў сапраўдную беларускую прэсу, а лёс беларускага рэдактара пад Польшчай — гэта была пэўная турма. Чым далей, тым больш **пальцы польскае цэнзуры зацісналі беларускае жывое слова. Беларускія** газэты канфіскаваліся, а, урэшце, зачыняліся. У савецкай (усходняй) Беларусі прэса спачатку калі й была насычана беларускім духам, **то вельмі хутка яе пачалі ўпрагаць у бальшавіцкія аглоблі.** Калі-ж нацыянальны дух там быў наагул забіты, ніякіх магчымасьцяў для разьвіцьця беларускае прэсы не асталося. Найменшая спроба асьвятленьня ў сапраўды беларускім духу нашага жыцьця лічылася «ухілам», «нацдэмаўшчынай» і ліквідавалася з мейсца. **Прэса ў сав. Беларусі сталася атрутай для беларусаў, аружжам барацьбы супроць беларўскага народу. Гэта была не беларуская, а жыдоўска-бальшавіцкая прэса.** Бальшавікі крычалі аб тым, што яны выдаюць масу газэт у мовах розных нацыянальнасьцяў. У Сав. Беларусі, сапраўды, было шмат «раённых» і г. зв. «цэнтральных» газэт, але ўсё гэта былі органы камуністычнае партыі і тое, што трэба было партыі, тое ў іх і пісалася. Ніякай свабоды слова ня было. За свабоднае слова людзі ішлі на той сьвет. Нават у літаратурных часапісах у беларускай мове — былі адны бальшавіцкія гымны і хваласьпевы, якія ў нармальнага, здаровага беларуса выклікалі амаль заўсёды гідлівасьць. Асабліва ў прэсе праводзіўся ідэйны прынцып: «культуры нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьместу».

Якое палажэньне цяпер? Пасьля ваеннае буры пачынае памаленьку буйнець нашае жыцьцё, пачынае ажываць і наша прэса. Праўда, беларускіх газэт яшчэ няшмат, да дзесяці. Але адно трэба сьцьвердзіць: **беларуская сучасная прэса мае ўсе магчымасьці, мае паўнейшую свабоду асьвятляць беларускае жыцьцё з беларускага гледзішча, яна мае магчымасьць спаўняць сапраўднае сваё прызначэньне ў сучасны мамэнт — выхоўваць нацыянальна свой народ.** Буйныя парасткі, якія пусьціла беларуская прэса цяпер, сьведчаць, што яна мае ўжо за сабой школу, што яна ўжо зьяўляецца неабходным варункам нашага нацыянальна-народнага жыцьця. Далейшыя нашыя высілкі, далейшы разгон нашае працы над адраджэньнем народу пацягнуць у насьледку за сабой разбудову нашае прэсы. Мы не зьяўляемся аптымістамі і дасканальна разумеем, што гэта яшчэ толькі пасеў, але з радасьцю можам сказаць толькі адно: **газэта, якая выходзіць цяпер, зьяўляецца сапраўды беларускай, бо мы можам у ёй свабодна пісаць аб Беларусі.**

У сучасны мамэнт значэньне беларускага друку, прэсы перадусім, аграмаднае. Прэса арганізуе грамадзкае й культурнае жыцьцё, прасякае, так сказаць, ува ўсе куткі грамадзкага жыцьця. Яна мае ў сучасны мамэнт асаблівае значэньне ў палітычна-нацыянальным узгадаваньні нашага народу. Перад намі вырастаюць цяпер розныя заданьні, і ў залежнасьці ад таго, як мы іх разьвяжам, залежыць часта посьпех нашых высілкаў. Прэса павінна дзеля гэтага каваць нашае грамадзянства для выпаўненьня вырастаючых перад намі заданьняў. **Прэса павінна быць тым аружжам, якое мабілізуе ўсе нашыя народныя сілы для супольнага нацыянальна-народнага высілку.** Гэта ў сваім часе разумеў Кастусь Каліноўскі, які жыў у зусім іншых умовах, як мы. Тады беларускі дух яшчэ драмаў у нетрах сялянскіх масаў. Кастусь Каліноўскі быў першым з тых, хто яго пачаў будзіць да жыцьця. Цяпер беларускі рух шырокай хваляй разьліўся па нашай Бацькаўшчыне. Нашыя заданьні лягчэй выпаўніць.

## З беларускага жыцьця

**Сьвяткаваньне юбілеяў.** У нядзелю—19. VII. г. г. беларуская калёнія ў Варшаве сьвяткавала 425 ўгодзьдзі беларускага друку, 80-перакладу на беларускую мову Бібліі і 80 ўгодкі беларускага палітычнага друку —выхаду ў сьвет «Мужыцкае Праўды» Кастуся Каліноўскага.

Былі прачытаны ў зьвязку з гэтым рэфэраты № Старшынёй К-ту Др. Шчорсам на сэму: «Гісторыя беларускага друку — гэта доказ культурнай сьпелаьці Беларускага Народу», і Кіраўніком Культ. Аддзелу П. Татарыновічам на тэму: «Абавязак карыстаньня з друкаванага роднага слова».

**Беларускі народны календар на 1942 г.**

Краёвае Выдавецтва ў Менску выдала «Беларускі Народны Календар на 1942 г.». Выданьне календара вельмі прыгожае і, як на ваенны час, даволі багатае. Зьвяртае на сябе ўвагу, перадусім, мастацкае аздабленьне календара.

**Менскія татары ізноў маюць сваю мэчэць.**

Мэчэць у Менску, якую бальшавікі замянілі ў склад, гэтымі днямі ізноў даведзена да свайго папярэдняга прызначэньня. Яна зьвернута на сьвятыню 1.200 татарам, якія жывуць сярод 100.000 жыхароў Менску. На першым набажэнстве мула татарскага прыгоду дзякаваў за свабоду, якую прынёс Адольф Гітлер для рэлігійнага жыцьця мусульманаў у Менску.

# АПУСЬЦЕЛЫЯ ПАРТЫ

**Балянс баёў на Атлянтыцкім акіяне.**

На працягу ліпеня марскімі і паветранымі сіламі затоплена 815.900 БРТ. Як і ў папярэдніх месяцах, найбольшыя вынікі паказалі падводныя лодкі, але не бязьдзейнічала й лятунства. Пры гэтым некаторыя меншыя ваенныя караблі палі ахвярай нямецкага ваенна-марскога флоту. Марскія баі не завязваліся. Вораг усьцяж хваліцца, што мае вялікі флот, але яму прыходзіцца хаваць свае ваенныя караблі, як мага. У імпануючай цыфры няўлічаны цяжка пашкоджаныя караблі, а з ранейшага досьледу й прызнаньняў, якія час ад часу ўсё-ж робіць вораг, можна заключыць, што ня ўсе пашкоджаныя караблі даплываюць да партоў.

Шмат партоў апусьцела. Гэта найлепш сьведчыць аб узрастаючым недахопе танату. А тымчасам ува ўсіх партох склады напоўнены важным ваенным матарыялам. Англія і Амэрыка вельмі ахвотна зужылі-б гэтыя тавары, каб толькі мелі да гэтага караблі. Нават тыя краіны, якія пасьпешна прымкнулі да пакту аб паязычцы й арэндзе, чакаюць надарэмна даставак, якія ім даўно ўжо абяцалі. Парты Леванту асабліва ў апошнія чатыры тыдні апусьцелі. Карабельная камунікацыя з Паўдзённай Амэрыкай таксама вельмі зьменшылася, так, што адна краіна за другой адкрыта або паціху пачынаюць наракаць. Гэтыя краіны чуюць, што ЗША іх ашукалі. А ЗША ці ня хочуць ці ня могуць бачыць тае небясьпекі, якая пагражала іх гандлёваму флоту. У кожным выпадку, сягоньня напракаюць Вашынгтон, што ён няпэўна выпаўняе фінансавыя й гандлёвыя забавязаньні й умовы, калі ня-ма патрэбнага танажу, каб утрымаць марскую сувязь. Вашынгтон гэтымі днямі, пасьля нямецкіх посьпехаў, якія выразіліся ў 815.900 БРТ, пабачыў сябе змушаным выдаць новы сьпісак дапушчаных да ўвозу тавараў. Гэты сьпісак быў меншым ад папярэдняга, у ім уведзены новыя аграничэньні ўвозу. Можна быць пэўнымі, што гэтыя аграничэньні будуць яшчэ больш павялічаны.

# Польскі-рускі-беларускі

**(кароткі фельетон).**

І з чаго ўся гэтая чаўпня выйшла? —адзін сьмех ды толькі. Людзям нават сорамна казаць. А і так яшчэ ўсё добра скончылася. Нос толькі аднаму расквасілі, крэсла ў кавалачкі разьляцелася, а мне

—Нічога, Грыпінка,—кажу, —не палохайся ты толькі рыбка. Гэта зноў, мусіць, тыя гіцлі сварку сваю праводзяць. Зараз я іх шэльмаў да парадку прывяду.

лазьні, валіць, перавернуты стол чатырма нагамі помсты неба за зьнявагу дамагаецца. Крэсла ў дробныя кавалачкі пашчэпана. А яны стаяць на сярэдзіне пакою і, як тыя пеўні, да вачэй сабе скачуць. Аднаму ўжо і кроў з носа паказалася. У самую нюхаўку удар атрымаў, значыцца.

Як каршун, я тады да іх кінуўся, схапіў за каркі, як тых шчанят, што добры

І зноў ім каркі паціснуў. Запішчалі яны, заенчалі і не чапаць сябе паабяцалі.

Пусьціў я іх тады і пытаю:

—І што гэта вас, аболтусаў, да барацьбы змусіла, каторы з вас другому каяўчыну адбіў?

— Ды не — кажа Мікола. — Ня тое выйшла, што ты казаў, на думы маеш